# ПАРК У СЯДЗІБЕ АЛЬШЭВА



**Альшэва ў 1915 годзе**

**“...Але не, Альшэва - гэта не звычайная сядзіба. Альшэва – гэта дзіўная візітная картка ў гэтай маляўнічай краіне сноў. Паглядзіце яшчэ раз. Недзе ўнізе, у глыбокай, зарослай даліне, раптам з’яўляецца сядзіба і ў блакітна-шэрым тумане акрэсліваецца няпэўнымі контурамі, прыцягваючы таямнічасцю сваёй глухой адасобленасці.**

**Над шырокай сажалкай, у купах высакарослых старых дрэў, зграбна туляцца адна да адной пабудовы. А за імі, на крутых пагорках, лесапарк. І ўзбярэжжа выгінаецца пакручаста, то выступаючы парослымі алешнікамі мысамі, то перацякаючы ў цёмна-зялёныя затокі, па якіх збіраюцца і блукаюць шарсцістыя туманы. Дома не відаць - яе раўніва засланяюць дрэвы, што дрэмлюць ля вады. Высокія, разгалістыя, вечныя, яны захопліваюць усю плошчу сажалкі, увесь ланцуг узгоркаў, рассыпаюцца па іх, караскаюцца ўверх, боўтаюцца і адбіваюць свае галіны ў змрочным люстэрку вады...” (аўтарскі пераклад)**

Можна і сёння зразумець уражанні Яна Булгака, знакамітага беларускага і польскага фатографа, які ў 1930-я гады часта наведваў сядзібу ў Альшэва.

Ужо шмат стагоддзяў назад гэтыя мясціны валодалі магнетычнай маляўнічасцю, бо нездарма менавіта тут, у краі Блакітных азёр, напрыканцы XVIII стагоддзя залажыў радавую сядзібу першы з роду Хамінскіх - Людвік Якуб.



**Сасна Веймутава**

Прывітанне з тых старадаўніх часоў будзе сустракаць вас яшчэ на пад’ездзе да Альшэва. Магутнае дрэва ў баку ад дарогі звяртае на сябе ўвагу сваёй веліччу і прыгажосцю. Гэта ўнікальны экзэмпляр сасны Веймутава ўзростам больш за 300 год, які захаваўся да нашых часоў ад алеі, высаджанай уздоўж дарогі Людвікам Якубам Хамінскім да новай сядзібы. А векавыя дрэвы на абрывістых пагорках ракі Страча быццам запрашаюць да вандроўкі ў часе пад іх вялікімі кронамі па гісторыі сядзібна-паркавага комплексу Хамінскіх.



Гісторыя пачалася, калі напрыканцы XVIII стагоддзя ў атачэнні прыгожага парка ў лепшых традыцыях драўлянага дойлідства тых часоў быў пабудаваны сядзібны дом. У перыяд росквіту эпохі барока парк быў закладзены як рэгулярны тэрасны менавіта ў гэтым стылі, і меў выгляд прастакутніка з 5 тэрасамі ўздоўж ракі Страча.

Гасподскі дом месціўся на другой тэрасе, пры гэтым парадны ўезд з брамай займаў частку першай і другой тэрасы і быў акружаны шчыльнымі групамі старых дрэў. Трэцяя тэраса шырынёй у 40 метраў служыла паркавым партэрам, аформленым з двух бакоў лінейнай пасадкай ёлкі звычайнай. Далей, чацвёртая тэраса была адкрытая. Яе адкрытасць дазваляла аглядаць найбольш складаную ў кампазіцыйных адносінах пятую тэрасу шырынёй 50 метраў з двума ліпавымі масівамі, якія стваралі складаную сістэму прагулачнага шляху ў выглядзе сапраўднага лабірынту. Часткова да нашых дзён захаваліся ліпы ва ўзросце больш двух стагоддзяў, але на жаль контуры малюнка ўжо не праглядаюцца.

Апошняя тэраса была акружана невысокім валам, які абмяжоўваў непасрэдна тэрыторыю рэгулярнага парку, які працягваўся чыста сімвалічна і далей злучаўся з лясамі Блакітных азёр. Падчас час рэканструкцыі сядзібы ў другой палове XIX ст. паркавую зону таксама чакалі змены. Захоўваючы базавыя рысы барочнага стылю, парк ператварыўся ў пейзажны і быў павялічаны да 10 гектараў за кошт лясных масіваў з краю Блакітных азёр.

Былі высаджаны ліпавая, дубовая, бярозавыя, явaравая алеі. Дарэчы зараз, адзінкавыя захаваўшыся экзэмпляры явару з’яўляюцца самымі старымі дрэвамі гэтага віда ў Беларусі. Адна з прагулачных сцежак ішла наверсе ўздоўж крутых берагоў Страчы, а ўнізе ўсіх жадаючых паплаваць па ставах чакала прыстань з лодкамі.

У паркавай зоне перад цэнтральным уваходам у дом напрыканцы XIX ст. з’явіўся яшчэ адзін цікавы элемент – каменны сонечны гадзіннік. Есць меркаванні, што быў ён

зроблены з мясцовага валуна, з якога высякалі неабходныя элементы і перавозілі на санях зімой да сядзібы. З гэтага ж валуна была зроблена і прыгожая ўязная брама, якая ў атачэнні старых каштанаў шмат гадоў сустракала гасцей Хамінскіх. Зараз гэтую браму можна пабачыць у вёсцы Камарова на ўваходзе ў парк.



**брама ў Камарова (2024)**

Ніводны стары і цёмны парк не можа абысціся без паданняў. На беразе Страчы можна наткнуцца на невялікую крыніцу, з якой быў зроблены водаправод у дом. Быццам бы звычайная справа, але магчыма менавіта з гэтай крыніцай звязана цікавае сямейнае паданне Хамінскіх:

**“... Працаваў у сядзібе садоўнік і калі зімой у садзе было не шмат працы, займаўся пляценнем кошыкаў і кашоў і дапамагалі яму ў гэтым жонка і сын Янка. Калі неўзабаве бацькі Янкі памерлі, яго ўсынавіла пані і разам са сваім сынам Стасем адправіла вучыцца ў школу. Хлопчыкі пасябравалі, але калі Стась цікавіўся кнігамі пра вайну, то Янка ўдасканальваў свае навыкі ў пляценні. Ён плеў не толькі кашы з лазы і яловых каранёў, але і навучыўся плесці падвазоўніцы, хлебніцы, цукерніцы, шкатулкі і іншыя вырабы з лучыны, ліпавай кары, рагозу, саломкі.**

**Пані ўсе вырабы Янкі выстаўляла як аздобу інтэр’еру. Шматлікія госці захапляліся талентам юнака і многія жадалі набыць нешта для сабе. Тады пані абвясціла: “Каб зрабіць вам прыемнасць, мы з Янкам дамовіліся, што вы можаце браць сувеніры на памяць аб Альшэва за сімвалічны кошт, хто колькі ахвяруе. Усе грошы пойдуць Янку як падарунак ад вас на вяселле**

**Адным летам Янка пазнаёміўся з дзяўчынай Ганнай, яны закахаліся і задумалі ажаніцца. Але ў гэты час Стась запісаўся дабравольцам на турэцкую вайну, а Янка паехаў разам з ім яго ад’ютантам, а Ганна, чакаючы каханага, часта хадзіла на іх улюбёнае месца, і аднойчы з зямлі пачала біць крыніца. Ганна прыняла гэта за звестку аб тым, што яе любага няма ў жывых. Праз некаторы час прыйшла звестка пра тое, што Янка загінуў на той вайне, а пані не ведала, што зрабіць з сабраным срэбрам і высыпала ўвесь кош срэбных манет у гэтую бяздонную крыніцу ў якасці ахвяры за душу Янкі. З таго часу крыніца мела вельмі смачную ваду і многія наталялі ёй смагу...”**

А крынічку з тых пор пачалі называць “срэбнай” і вада ў ёй вельмі чыстая і празрыстая, з высокім зместам у саставе срэбра.

На першы позірк у парку можна не заўважыць самага цэннага, што схавана па-за былымі паркавымі сцежкамі пад цёмнымі кронамі старых дрэў. Сярод хмызняку і завалаў трапляюцца сапраўдныя чырвонакніжныя дыяменты: ятрышнік, архідэя “венерын чаравічак” і лясны цюльпан.



**лясны цюльпан**

Ятрышнік, ці «зязюльчыны слёзкі” - прыгожыя кветкі сямейства архідных, раней шырока траплялiся на прасторах палян i лясоў, зараз, на жаль, знаходзяцца пад пагрозай знішчэння, як і чароўная архідэя “вянерын чаравічак", якая ўвогуле знаходзіцца пад пагрозай глабальнага знікнення.

Сапраўдным вясновым цудам распускаюцца лясныя цюльпаны, сапраўдная пярліна Альшэўскага парку. Дагэтуль дакладна не вядома, адкуль тут з’явіліся гэтыя кветкі, радзімай якіх з’яўляецца Паўднёвая Італія і Балканы, але сёння ў Беларусі вядома толькі два месцы, дзе можна пабачыць дзікія цюльпаны, і адно з іх – Альшэва.

Па ўспамiнам Хамінскіх спробы рассадзіць цюльпаны па іншым месцам былі не ўдалыя, кветкі гінулі і працягвалі расці толькі побач з Альшэўскай сядзібай.

Дзіўныя таямніцы прыгожых мясцін, якія працягваюць прываблiваць падарожнікаў і аматараў гісторыі і спадчыны і ў нашы часы.